Тэкст для праверкі навыка чытання

Ліпка

Восенню дрэўцы прывезлі з далёкага лесу. Сваё ўбранне яны пакінулі там, дзе нарадзіліся, і цяпер без лісця ляжалі перад нашым домам.

Вечарам людзі прыйшлі з работы і пачалі выбіраць лепшыя: большыя, раўнейшыя, купчастыя. Кожнаму хацелася пасадзіць перад сваім домам прыгажэйшае дрэўца.

Засталася адна танклявая ліпка з трошкі выгнутым ствалом, і ніхто не хацеў яе браць. Што сказала б яна, каб магла гаварыць?

«Тут было шмат маіх аднагодкаў, іх забралі ўжо. А мяне, крывенькую, колькі разоў падымалі, разглядалі з усіх бакоў і зноў клалі на зямлю. А хіба ж я вінавата, што выросла такая?»

Ліпцы сапраўды не пашчасціла. Калі яна была яшчэ маленькая, бура паблізу вывернула тоўстую елку. Ліпка расла і хутка ўперлася вершалінай у вы́варацень. Яна схіліла свой стан, а выпрастацца ўжо не змагла.

Потым прышлі рабочыя спілоўваць вы́варацень, і адзін з іх пашкадаваў дрэўца.

— Глядзі, як пакалечыла елка бедную ліпку, — сказаў ён свайму сябру.

— Нічога, сонца выпрастае, — адказаў той. — Трэба толькі асцярожна спілаваць вываранень, каб не зламаць яе, кволенькую.

І людзі з добрым сэрцам не загубілі маладзенькае дрэўца. Цяпер ліпцы было прасторна, і яна расла, дужэла.

Потым зноў прышлі людзі. На гэты раз з песнямі, з гоманам. Гэта былі школьнікі. Ліпка ніколі не здагадалася б, чаго яны прыйшлі, каб адзін з вучняў не сказаў:

— Выкапаем і гэтую. Няхай едзе ў горад.

— Крывава́тая трошкі, — пакруціў галавою другі. — Там знаеш, як упрыгожваюць вуліцы!

— А чым яна вінавата? Хіба там людзі не ведаюць, што не ўвесь лес роўны? Выкапаем, — і хлапчук узяўся за працу.

І вось ліпка ў горадзе. Яе суседак людзі разабралі і пасадзілі, а яна — адна-адзінюткая — ляжыць на зямлі.

Туга́ апанавала дрэўца: «Няўжо людзям цяжка выкапаць ямку і пасадзіць мяне ў зямлю? Абы-дзе, калі лепшыя месцы аддалі лепшым».

Вярнуўся Віця са школы, убачыў пакінутую ліпку, падняў яе, уздыхнуў і сказаў:

— Я знайду табе месца.

Ён выкапаў ямку далей ад дома, дзе ўвесь дзень не бывае ценю, пасадзіў дрэўца ўвагну́тым бокам да сонца, каб лепей заплывала крывізна, і пажадаў:

— Расці, ліпка, купчастая ды вялікая!

І ўвесну ліпка першая зазелянела і першая напомніла людзям аб прыгожай пары года — вясне.

Текст для проверки навыка чтения

Надоевшие подарки

Лена очень любила розы и пушистых хомячков. Проснувшись утром в день своего рождения, девочка увидела на окне горшок с маленьким розовым кустиком и коробку с рыжим хомячком. Радостная Лена бросилась целовать маму и папу.

Целый месяц Лена заботилась о розе и ухаживала за хомячком. Цветы розы распустились ещё больше и наполнили детскую комнату приятным ароматом. Хомячок настолько привык к своей маленькой хозяйке, что как только его вынимали из коробки, всюду бегал следом за Леной.

Шли дни. Кустик розы и хомячок надоели Лене. Розовый кустик нужно было каждый день поливать и поворачивать к солнцу. За хомячком нужно было каждый день убирать и чистить коробку, чтобы в комнате не было неприятного запаха. И вот однажды Лена вынесла розовый кустик и коробку с хомячком на балкон.

— Пусть теперь кустик дождь поливает, — решила она. — И за хомячком можно не убирать. На балконе свежий воздух, а значит, и запаха никакого не почувствуешь.

Кустик с хомячком остались совсем одни. Лена забыла про них. Однажды сильный порыв ветра свалил с перил горшок с розовым кустиком. Он разбился об асфальт. Хомячка утащила большая чёрная ворона.

Когда Лена вспомнила о подарках, их уже не было на балконе. Девочка поняла, что произошла беда, и почувствовала себя виноватой. После этого случая родители решили больше не дарить ей живых подарков.